УДК 8

# ЛІЧБАВЫ АРХІЎ ДАСЛЕДЧЫКА XXI СТАГОДДЗЯ

**В.Ю. Лесюк. Ф.І. Рацык**
**ДУА "Дастоеўская сярэдняя школа імя Ф. М. Дастаеўскага"**

Ўжо некалькі гадоў займаючыся ў этнаграфічным гуртку, заўсёды на занятках праглядаем этнаграфічныя фільмы і праслухванне аўдыёзапісаў носьбітаў традыцыі. Нас зацікавіла, як адбываецца працэс запісу выканаўцаў і што адбываецца далей з гэтымі матэрыяламі. Вывучаючы этнаграфію Заходняга Палесся – мы прыйшлі да высновы, што гэта адзін з рэгіёнаў Беларусі, дзе «жывая фальклорная памяць» народа жыве дагэтуль; а скарбы народнай культуры перадаюцца паміж пакаленнямі вусным шляхам, без пісьмовай фіксацыі і развучвання па пісьмовых крыніцах, на чым асабліва трэба засяродзіць увагу даследчыкам у XXI стагоддзі.

Мэта даследавання: выяўленне актуальных праблем пераймання і захавання элементаў традыцыйнай культуры шляхам дэманстратыўнай антрапатэхнікі з дапамогай лічбавых архіваў ў сучасным грамадстве.

Мэта дасягаецца вырашэннем наступных задач:

- апісаць спосабы захавання аудыёвізуальных дадзеных этнаграфічных даследаванняў і далейшае іх выкарыстанне;
- высветліць магчымыя праблемы доступу да лічбавых архіваў;
- вызначыць найбольш аптымальныя магчымыя шляхі пераймання зафіксаваных этнаграфічных дадзеных метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі.

Аб'ект даследавання: матэрыялы этнаграфічных даследаванняў, іх захаванне, ахова і даступнасць для сучаснага даследчыка.

Прадмет даследавання: праблема захавання і пераймання элементаў традыцыйнай культуры ў сучасным грамадстве метадамі дэманстратыўнай антрапатэхнікі з дапамогай сучасных лічбавых тэхналогій.

Палявая работа сённяшняга этнографа даволі моцна адрозніваецца ад той, якую рабілі яго калегі яшчэ не так даўно. Купіў новы смартфон — самы час заняцца аудыёвізуальнай антрапалогіяй! Цяпер у этнаграфічных экспедыцыях у вялікай колькасці збіраюцца лічбавыя фота і відэа матэрыялы. Лічбавыя фотаматэрыялы маюць вялікія перавагі ў параўнанні з аналагавымі. Тут няма абмежавання ў фотакадрах і колькасці фотастужак. На вонкавых вінчэстарах можна захаваць практычна любую колькасць фотакадраў і відэазапісаў. Мінулае дзесяцігоддзе спрасціла магчымасць размяшчаць і абменьвацца файламі праз віртуальныя сховішчы і стварэнне электронных баз дадзеных і медыятэк.

Сучасны даследчык-этнограф, мае намнога больш магчымасцей па зборы фіксацыі і захаванні элементаў традыцыйнай культуры ў параўнанні з мінулым XX стагоддзем, але пры адсутнасці ў жывым бытаванні нейкай этнаграфічнай з'явы на дапамогу прыходзіць алічбоўка архіўных матэрыялаў па даследуемай тэме. Напрыклад, у 2014 годзе ўдалося знайсці і алічбаваць фільм з ігрой беларускіх дудароў, які быў створаны ў 1939 годзе, які дазволіў даследчыкам больш дэтальна пазнаеміцца з трыдыцыйным выканальніцтвам на дудзе.

Музыкі з Іванаўскага раёна неаднаразова прыцягвалі ўвагу даследчыкаў традыцыйнага мастацтва. Так у 2018 годзе была алічбавана магнітафонная стужка з архіва Іны Дзмітрыеўны Назінай і выпушчаны якасны электронны альбом, ў якім можна паслухаць анлайн запісы скрыпача з вёскі Гаравата Прыбышчука Віктара Калістратавіча. Такім чынам, апублікаваныя аўдыёзапісы самабытных музыкаў з'яўляюцца аднымі з лепшых па якасці гуку, даюць выразнае ўяўленне пра традыцыйную манеру грання і з'яўляюцца важнай крыніцай для яе аднаўлення.

Вялікую увагу захаванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны надае міжнародная арганізацыя ЮНЕСКА. Для ўключэння ў Беларускі рэспубліканскі Нацыянальны інвентар ведаў, традыцый і практык неабходна атрымліваць пісьмовую згоду носьбіта традыцыі, якая змяшчае персанальныя звесткі носьбіта і яго добраахвотнае жаданне прымаць удзел у мерапрыемствах па іх захаванні. Актуальнае пытанне пра папярэднюю згоду носьбітаў, нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору дазваляе ў будучым абапірацца на атрыманыя запісы пры выкарыстанні іх у навуковых даследаваннях і публікацыях.

Ў Беларусі адной з акрэдытаваных ЮНЭСКА арганізацый, якая ажыццяўляе увесь цыкл этнаграфічных даследаванняў з'яўляецца Студэнцкае этнаграфічнае таварыства. Адзін з важных кірункаў дзейнасці Таварыства - выданне сабраных матэрыялаў. І найперш - электронных спеўных складанак па выніках экспедыцый. Сюды трапляюць самыя цікавыя палявыя запісы, спевы і расповеды.

Анлайн-медыятэка утрымлівае апублікаваныя матэрыялы па этнаграфіі (аўдыё, відэа, кнігі, прэса і г.д.) па рэгіёнах, тэмах, персаналіях, калектывах і г.д. На публічным сайце даступныя пошук, каталогі і апісанні публікацый. Напрыклад, ў Медыятэцы #ЭТНАЎСЁ размешчаны матэрыялы, запісаныя на тэрыторыі Брэсцкай вобласці падчас экспедыцыі Студэнцкага таварыства у Ганцавіцкі, Кобрынскі і Пружанскі раён у 2015 і 2016 годзе. Яшчэ адзін з самых даступных спосабаў публікацыі з'яўляецца Youtube канал. Адзін з такіх каналаў, на якім размешчаны матэрыялы запісаныя у экспедыцыях на Брэсцкім і Гомельскім Палессі, належыць беларускай даследчыцы Ірыне Васільеўне Мазюк.

Асаблівую увагу трэба выдзеліць каналам беларускага тэлебачання, якія таксама выкладваюць ва усеагульны доступ цэлыя цыклы перадач. Тэлеканал "Беларусь 3", ў сетцы свайго вяшчання мае даволі цікавыя многасерыйныя перадачы, такія як "Беларуская кухня", "Наперад у мінулае", "Жывая спадчына", ў змесце якіх асвятляецца вялікая колькасць аб'ектаў традыцыйнай культуры і практык.

Асобна трэба спыніцца на запісах якія былі зроблены на тэрыторыі нашага Іванаўскага раёна. На працягу другой паловы XX стагоддзя Лабараторыя фальклору Філалагічнага факультэта БДУ праводзіла даследаванні ў нашым раёне і з 2019 года Электронная бібліятэка БДУ утрымлівае алічбаваныя копіі этнаграфічных матэрыялаў сабранымі ў розны час. Так па запыце "Іванаўскі раён" было атрымана 195 прывязаных па лакалізацыі спасылак на запісы народных песен з розных вёсак нашага раёна.

Такім чынам можна зрабіць выснову, што матэрыялы этнаграфічных даследаванняў, якія выконваліся на тэрыторыі Іванаўскага раёна, алічбаваныя і апублікаваныя зацікаўленымі ў гэтым асобамі, але пакуль недаступныя для шырокага ужытку і пераймання.

Па выніках даследавання можна зрабіць наступныя вывады.

1. Сярод актуальных праблем пераймання і захавання элементаў традыцыйнай культуры і фальклору ў сучаснасці можна акрэсліць:

- недасканалае заканадаўства па абароне аўтарскіх правоў і інтэлектуальнай уласнасці на аб'екты нематэрыяльнай культуры і фальклору;
- адсутнасць аператыўнага доступу да аналагавых архіваў, якія захоўваюць запісы носьбітаў традыцыйнай культуры.

2. Выкарыстанне сучасных спосабаў фіксацыі матэрыялаў аўдыявізуальнага характару і алічбоўкі аналагавых архіваў дазваляе больш поўна і грунтоўна адлюстраваць іх ў навуковых даследаваннях. Дзякуючы фальклорнаму руху у наш час сталі запатрабаванымі і папулярнымі этнаграфічныя лічбавыя архівы ў асяродку зацікаўленых народным мастацтвам жыхароў Беларусі.

3. Магчымыя сёння шляхі пераймання традыцыйных практык і ведаў метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі павінны апеліраваць да вывучэння аўдыя- і відэазапісаў з архіваў спецыялістаў і

дзяржаўных установ, што, пры правільным падыходзе і падтрымцы здольна даць плённы вынік у будучым.

## Спіс літаратуры

1. Станіслаў Чавус БЕЛАРУСКАЯ ДУДА Ў АЎДЫЯВІЗУАЛЬНЫХ КРЫНІЦАХ 1939 ГОДА. НОВЫЯ ЗВЕСТКІ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/123456789/18417/. Дата доступу: 01.02.2024.

2. Віктар Прыбышчук: скрыповыя найгрышы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://set.ethno.by/?p=6249. – Дата доступу: 01.02.2024.

3. Медыятэка Ірыны Мазюк [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/@iryna-maziuk – Дата доступу: 01.02.2024.

4. Перадача "Жывая спадчына". Беларусь 3 [Электронны рэсурс] –
Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=8P-IAlBapGU&list=PLmGv3zIr0LKDUx9OalUzxOc5TdWsZ5sT2 –
Дата доступу: 01.02.2024.

5. Медыятэка Этнаўсё. Іванаўскі раён [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://ethnoby.org/lakatsyi/564584417 – Дата доступу: 01.02.2024.

6. Katkawiec Mikałaj. Tyszkowicze rejon iwanowski, obwód brzeski BY [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://www.muzykapolesia.net/muzyka/508.html

7. Эталонный фольклористический мультимедийный банк [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://www.elib.bsu.by/handle/123456789/121899 – Дата доступу: 01.02.2024.